УДК 633.11.«324»:631.84

У. П. САМСОНАЎ, М. І. ПАРФЯНОВІЧ

УПЛЫЎ ДОЗ І ТЭРМІНАЎ УНЯСЕННЯ АЗОТНЫХ УГНАЕННЯЎ НА ЎРАДЖАЙ АЗІМАЙ ПШАНІЦЫ

Важнейшым фактарам павышэння прадукцыйнасці азімай пшаніцы з'яўляецца актывізацыя азотнага жыўлення. Азот паглынаецца раслінамі на ўсім працягу вегетацыі — ад усходаў да васковай спеласці [1].

Каб забяспечыць бесперапыннае забеспячэнне азімай пшаніцы гэтым элементам, неабходна дробнае яго прымяненне. Вывучэнне ўплыву розных тэрмінаў і доз аднаразовага і дробнага ўнясення азоту на ўраджайнасць азімай пшаніцы сорту Надзея праведзена ў калгасе імя Кірава Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая, цяжкасуглінкавая, якая развіваецца на цяжкім суглінку,